**Ёсць** такая прафесія – радзіму абараняць // Патрыёт (Ушачы). — 2006. — 22 лют. — С. 3.

## ЁСЦЬ ТАКАЯ ПРАФЕСІЯ – РАДЗІМУ АБАРАНЯЦЬ

Дзень абаронцаў Айчыны. Нягледзячы на канкрэтную спасылку свята, у нас заведзена віншаваць не толькі ветэранаў, якім давялося прымяніць зброю, не толькі бацькоў і братоў, што выканалі свой грамадзянскі абавязак у мірны час, але юнакоў і нават хлапчукоў. Так склалася, так адклалася ў свядомасці, што мужчына і армія – паняцці непадзельныя. Адзін звязвае з ёй усё жыццё, другі атрымоўвае загартоўку кароткіх, ці доўгіх два гады, і ганьбаваліся тыя, хто ўхіляўся ад службы.

Зараз сітуацыя мяняецца, далёка не ўсіх, нават жадаючых, могуць прыняць Узброеныя Сілы, ідзе адбор па загартоўцы, фізічнай сіле, арміі патрэбны кваліфікаваныя спецыялісты. І як у былыя часы – высокі конкурс у вайсковыя навучальныя ўстановы.

Афіцэр прызваны абараняць, нават цаной уласнага жыцця. Таксама і салдат, што прыняў прысягу. Бо ёсць такая прафесія – Радзіму абараняць, ганаровая, мужчынская і – рызыкоўная. Пра гэта добра ведаюць воіны-інтэрнацыяналісты, сябры, якія штогод наведваюцца на магілы загінуўшых землякоў. Не забыцца ніколі пра страту дзяцей бацькам, і не толькі ваяваўшых у Афганістане дзяцей. Не дачакалася з арміі сына Леакадзія Вітольдаўна Янулеўская з Селішча, якая таксама як і іншыя бацькі загінуўшых, атрымала сёлета матэрыяльную дапамогу. Ён загінуў у мірны час, на сваёй зямлі праз 7 месяцаў пасля прызыву. Быў апошнім сярод пяці дзяцей, якіх так складана выхоўваць і так невыносна хаваць маладымі.

Толькі ў арміі здараецца рознае. Пра гэта расказваў падчас сустрэчы са старшакласнікамі Вялікадолецкай школы Аляксандр Сяргеевіч Пугач, воін-інтэрнацыяналіст, былы мінамётчык. На яго вачах загінуў камандзір аддзялення і, атрымаўшы чарговае званне, ён замяніў яго. Расказваў пра здрады, пра страты, пра пераменлівасць мірнага насельніцтва.

І кожны з тых, хто ваяваў, спадзяецца, што не давядзецца прайсці праз гэта іх сынам і ўнукам. Удзячны беларускія маці палітыцы дзяржавы, што іх сыны служаць толькі на тэрыторыі Беларусі, што не калоцяцца ад хвалявання рукі сённяшніх маці, трымаючы ліст з нумарам вайсковай пошты.